В мгновение ока, с глазу на глаз, в оба глаза, куда глаза глядят.

***умение устанавливать соответствие***

Прочитайте. Что обозначают выделенные выражения в предложениях? Соедините каждое образное выражение с его значением.

| | |
|---|---|
| Бабушка учила меня **не совать нос** в чужие дела. | не следует важничать и зазнаваться |
| – Не нужно **задирать нос**, если получил хорошую отметку! – сказала мама. | не следует вмешиваться во что-либо |

Таким образом, целенаправленная и специально организованная работа с применением представленных видов упражнений на уроках русского языка будет способствовать активизации поисковой и творческой деятельности учащихся для решения учебно-познавательных задач, формированию умений решать учебно-практические задачи на основе общих способов действий.

**Список литературы**


1. Учебные программы по учебным предметам для учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания: 3-й класс / Министерство образования Республики Беларусь. – Минск : Национальный институт образования, 2017. – 204, [2] с.
2. Гулецкая, Е. А. Реализация компетентностного подхода в начальном образовании / Е. А. Гулецкая // Пачатковая школа. – 2016. – № 11. – С. 34–39.
3. Гулецкая, Е. А. Современные подходы при разработке дидактического материала к разделу «Глагол» в IV классе / Е. А. Гулецкая // Пачатковая школа. – 2017. – № 10. – С. 3–6.


---

# ВЫВУЧЭННЕ ТЭМАТЫЧНЫХ ГРУП БУДАЎНІЧЫХ НАЙМЕННЯЎ ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ КАМУНІКАТЫЎНА-МАЎЛЕНЧАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ БУДУЧЫХ НАСТАЎНІКАЎ


*Бабровіч Т.С.,*

*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, г. Мінск*



Анатацыя. У артыкуле раскрываюцца паняцці лексіка-семантычная і тэматычная група. У тэматычную групу ўваходзяць намінацыі, якія аб’яднаны прадметна-лагічнымі сувязямі, што дае магчымасць разглядаць іх з анамасіялагічных пазіцый. На прыкладзе будаўнічых тэрмінаў паказаны першасныя і другасныя найменні, аналіз якіх фарміруе камунікатыўна-маўленчую кампетэнцыю будучых настаўнікаў.



*Ключавыя словы: камунікацыя, намінацыя, лексіка-семантычная група, тэматычная група.*


Тэорыя і практыка маўленчай камунікацыі адыгрывае важную ролю ў сістэме падрыхтоўкі будучых настаўнікаў пачатковай школы. Таму вельмі важна пры ажыццяўленні адукацыйнага працэсу ўлічваць новыя дасягненні мовазнаўства і абапірацца на камунікатыўны аспект вывучэння тэрмінаў. Камунікацыя і намінацыя ўяўляюць сабой узаемазвязаныя паняцці і абумоўліваюць адзін адно. Як падкрэслівае А.С. Кубракова, «ужо прасцейшы акт камунікацыі ўключае намінацыю і прадугледжвае яе наяўнасць» [1, с. 6].

У сучаснай лінгвістыцы пры вывучэнні асобных найменняў можа быць выкарыстана два спосабы. Можна зыходзіць з існуючых слоў і вызначаць, якое яны маюць значэнне, альбо наадварот, можна зыходзіць з прадмета і вызначаць, пры дапамозе якіх сродкаў ён названы [2, с. 12]. У адпаведнасці з гэтым выдзяляюцца два напрамкі - семасіялогія і анамасіялогія.

Пры вывучэнні намінацый у семасіялагічным аспекце існуе традыцыя вычлянення розных лексічных груповак на аснове семантычнага падабенства або адрознення. Асобая ўвага надаецца праблемам сістэмнасці лексічнага ўзроўню мовы, дзе ў цэнтры знаходзяцца парадыгматычныя і сінтагматычныя адносіны. У аснове парадыгматычных адносін ляжыць семантычнае падабенства найменняў, наяўнасць агульных сем у семантычнай структуры розных слоў. Пад лексічнай парадыгмай звычайна разумеюць «аб'яднанне граматычна аднародных слоў, якія маюць семантычную еднасць» [3, с. 366]. Цэнтральнай адзінкай семантыкі з'яўляецца лексіка-семантычная група.

Класіфікацыя намінатыўных адзінак можа адбывацца і ў межах тэматычных груп, калі найменні аб'ядноўваюцца на падставе як лінгвістычных, так і нелінгвістычных характарыстык. Як адзначае І.А.Стэрнін, «значэнні слова могуць дыферэнцыравацца паводле тэматычнай сферы ўжывання» [4, с. 22]. Уздзеянне тэматычнай сферы зносін, тэматычнага кантэксту на рэалізацыю значэння слова тлумачыцца функцыянаваннем у працэсе моўных зносін прынцыпу тэматычнай аднароднасці. Такая з'ява звязана з наяўнасцю ў свядомасці чалавека тэматычных слоўных груповак [4, с. 22].

Па словах Л.А.Шкатавай, пры вывучэнні найменняў з анамасіялагічных пазіцый у большасці выпадкаў апісваюцца групы, элементы, якія валодаюць агульнай функцыяй, але не маюць агульных лінгвістычных дыферэнцыяльных прыкмет [2, с. 13]. Таму пры вывучэнні намінацый у складзе тэматычных груп можна вырашаць розныя анамасіялагічныя задачы, што садзейнічае фарміраванню камунікатыўна-маўленчай кампетэнцыі настаўнікаў пачатковых класаў. Даследаванні, накіраваныя на вывучэнне анамасіялагічных характарыстык прадметных найменняў, дазваляюць не толькі раскрыць сутнасць працэсаў намінатыўнай дэрывацыі, але і зразумець асаблівасці члянення экстралінгвістычнай рэчаіснасці носьбітамі мовы.

Так, намінацыі будаўнічай сферы ўяўляюць сабой шматлікую тэматычную групу. Яны з'яўляюцца даволі ўжывальнымі як у вусным, так і пісьмовым маўленні. Для аналізу намі абраны тэматычныя падгрупы будаўнічых тэрмінаў «будаўнічыя матэрыялы і рэчывы», «тыпы будынкаў і памяшканняў», «будаўнічыя канструкцыі, іх часткі і элементы».

Разглядаючы будаўнічыя найменні з анамасіялагічных пазіцый, мы выдзяляем першасную і другасную намінацыю. Як адзначаюць даследчыкі, першасная, пачатковая намінацыя з'ява дастаткова рэдкая. Працэс першаснай намінацыі абсалютна адвольны. Пад адвольнасцю разумеецца, перш за ўсё, нематываваная прыродай рэчаў сувязь азначальнага і азначаемага [5, с. 22]. Другасныя

наміналыі ўспрымаюцца як вытворныя паводле марфалагічнага складу альбо па сэнсе. Вылучаюць наступныя сродкі: 1) словаўтварэнне як рэгулярны спосаб стварэння новых слоў і значэнняў; 2) сінтаксічная транспазіцыя, пры якой марфалагічныя сродкі ўказваюць на змену сінтаксічнай функцыі пры захаванні лексічнага значэння; 3) семантычная транспазіцыя, якая не змяняе матэрыяльнай абалонкі пераасэнсаванай адзінкі прыводзіць да ўтварэння мнагазначных слоў, а таксама фразеалагізмаў разнастайных тыпаў [3, с. 337].

Вынікі аналізу па тэматычных падгрупах можна прадставіць у наступных табліцах.

**Назвы будаўнічых матэрыялаў і рэчываў (387 намінацый)**

| Першасная намінацыя | | Другасная намінацыя | | |
|---|---|---|---|---|
| Намінацыі з агульнаславянскай мовы | Запазычанні | Семантычная дэрывацыя | Словаўтварэнне | |
| | | | афіксацыя | кампазіты |
| *15 намінацый* | *110 намінацый* | *17 намінацый* | *65намінацый* | *180 намінацый* |
| 3,8 % | 28,4 % | 4,4 % | 16,8 % | 46,6 % |
| 32,2 % | | 67,8 % | | |

**Назвы будынкаў і памяшканняў (202 намінацыі)**

| Першасная намінацыя | | Другасная намінацыя | | |
|---|---|---|---|---|
| Намінацыі з агульнаславянскай мовы | Запазычанні | Семантычная дэрывацыя | Словаўтварэнне | |
| | | | афіксацыя | кампазіты |
| 7 намінацый | 73намінацыі | 4 намінацыі | 58 намінацый | 60 намінацый |
| 3,5 % | 36,2 % | 1,9 % | 28,7 % | 29,7 % |
| 39,7 % | | 60,3 % | | |

**Назва будаўнічых канструкцый, іх частак і элементаў (231намінацыя)**

| Першасная намінацыя | | Другасная намінацыя | | |
|---|---|---|---|---|
| Намінацыі з агульнаславянскай мовы | Запазычанні | Семантычная дэрывацыя | Словаўтварэнне | |
| | | | афіксацыя | кампазіты |
| 7 намінацый | 84 намінацыі | 48 намінацый | 77 намінацый | 15 намінацый |
| 3,1 % | 36,4 % | 20,7 % | 33,3 % | 6,5 % |
| 39,5 % | | 60,5 % | | |

Такім чынам, словы ў тэматычныя групы аб'ядноўваюцца на падставе як лінгвістычных, так і нелінгвістычных характарыстык, што дае магчымасць праводзіць анамасіялагічны аналіз моўнага матэрыялу. Такі падыход дапама-

гае бачыць сувязь моўных з’яў з абазначэннем акаляючай нас рэчаіснасці, з выбарам і стварэннем назваў для асобных яе фрагментаў і тым самым, фарміруе камунікатыўна-маўленчую кампетэнцыю будучых настаўнікаў.

**Спіс літаратуры**


1. Кубрякова, Е. С. Части речи в ономасиологическом освещении / Е. С. Кубрякова. – М. : Изд-во ЛКИ, 2010. – 120 с.
2. Шкатова, Л. А. Ономасиологические проблемы русской терминологии / Л. А. Шкатова. – Челябинск, 1982. – 87 с.
3. Лингвистический энциклопедический словарь / под ред. В. Н. Ярцева. – М. : Советская энциклопедия, 1990. – 685 с.
4. Стернин, И. А. Проблемы анализа структуры значения слова / Стернин И. А. – Воронеж : Изд-во Воронеж. ун-та, 1979. – 156 с.
5. Уфимцева, А. А. Лексическая номинация (первичная, нейтральная) / А. А. Уфимцева // Языковая номинация (Виды наименований). – Москва, 1977. – С. 5–85.


# РОЛЯ МІЖПРАДМЕТНЫХ СУВЯЗЕЙ У ФАРМІРАВАННІ АНАМАСТЫЧНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ


*Вагулька М.А.,*
*ДУА «Гімназія №2 г. Магілёва», г. Магілёў*



Анатацыя. У артыкуле раскрываецца роля міжпрадметных сувязей пры фарміраванні анамастычнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў, прыводзяцца прыклады практыкаванняў, заснаваных на інтэграцыі розных школьных прадметаў.



*Ключавыя словы: анамастычная кампетэнцыя, антрапонім, тапонім, міжпрадметныя сувязі, руская мова, беларуская мова, літаратурнае чытанне, «Чалавек і свет».*


Сучаснае, постіндустрыяльнае, грамадства, вылучаецца полікультурнасцю, сацыяльнай мабільнасцю, адкрытасцю, інфармацыйнасцю. У сувязі з гэтым многія традыцыйныя сацыяльныя праблемы патрабуюць новых падыходаў да іх вырашэння.

Сістэма ўласных імёнаў, якая бытуе у пэўным грамадстве, адна з першых рэагуе на сацыяльныя змены. У сучасным беларускім грамадстве ўзнікае шэраг пакуль што не вырашаных пытанняў функцыянавання онімаў, сярод якіх – суадноснасць антрапонімаў у рускай і беларускай мовах, транслітарацыя антрапонімаў сродкамі лацінскай мовы [4], правапіс і скланенне ўласных імёнаў у рускай і беларускай мовах і інш.

Сучасная сітуацыя патрабуе ад кожнага члена грамадства наяўнасці базавых ведаў па ўжыванні ў маўленні ўласных імёнаў. Таму можна паставіць пытанне пра фарміраванне анамастычнай кампетэнцыі, бо, як вядома, кампетэнцыя – гэта перш за ўсё заказ грамадства [6]. Пачатак фарміраванню гэтай кампетэнцыі павінен быць закладзены на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі.